**БЕЛАРУСЬ**

**Міжнародная справаздача аб свабодзе веравызнання за 2006 год**
Падрыхтаваная Бюро па пытаннях дэмакратыі, правоў чалавека і працы.

Канстытуцыя гарантуе права на свабоду веравызнання, тым не менш, на практыцы ўлады абмяжоўвалі гэтае права.

За справаздачны перыяд сітуацыя з павагай да свабоды веравызнання пагаршалася, улады не аднолькава паважліва ставіліся да розных канфесій, хоць і назіраліся пэўныя змены ў лепшы бок. Урад працягваў абмяжоўваць свабоду веравызнання ў адпаведнасці з палажэннямі прынятага ў 2002 годзе Закона "Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацый" і прынятага ў 2003 годзе пагаднення з Беларускай праваслаўнай царквой (БПЦ), адгалінаваннем Рускай праваслаўнай царквы (РПЦ) і адзіным афіцыйна прынятым праваслаўным веравызнаннем. Нягледзячы на тое, што ў краіне не існуе дзяржаўнай рэлігіі, пагадненне надае БПЦ прывілеяваны статус. Улады зняволілі духоўную і свецкую асобу, а таксама праследавалі і штрафавалі членаў некаторых рэлігійных груп, у першую чаргу тых, хто расцэньваецца ўладамі як праваднікі іншаземнага культурнага ўплыву або як палітычна заангажаваныя. У прыватнасці, пратэстанты заслужылі да сябе негатыўнае стаўленне, трэба меркаваць, дзякуючы сваім відавочным стасункам са Злучанымі Штатамі. Закон аб рэлігіі 2002 года, які прадпісваў усім рэлігійным групам прайсці перарэгістрацыю, працягваў ствараць праблемы для некаторых рэлігійных меншасцяў, якім улады адмовілі ў перарэгістрацыі. Тым не менш, у перыяд, ахоплены гэтай справаздачай, сітуацыя ў нечым палепшылася ў адносінах да шэрагу рэлігійных меншасцяў, у тым ліку да прыхільнікаў рымска-каталіцкай царквы.

Пераважна прыязныя адносіны паміж рэлігійнымі групамі і пашыраная ў грамадстве этыка памяркоўнасці спрыялі свабодзе веравызнання, аднак за справаздачны перыяд меў месца і шэраг актаў вандалізму ў дачыненні да культавых месцаў і рэлігійных помнікаў. Да таго ж, варожыя і нецярпімыя адносіны з боку некаторых друкаваных выданняў садзейнічалі фармаванню негатыўнага стаўлення да некаторых рэлігійных меншасцяў. Аднак БПЦ прадпрыняла шэраг крокаў па барацьбе з распаўсюджаннем прапаганды, дыскрымінацыйнай у адносінах да іншых рэлігійных груп.

Урад Злучаных Штатаў Амерыкі абмяркоўвае пытанні свабоды рэлігіі з урадам Беларусі ў межах сваёй знешнепалітычнай дзейнасці па абароне правоў чалавека, тым не менш, афіцыйныя асобы адхілялі прапановы прадстаўнікоў урада ЗША абмеркаваць праблемы рэлігіі.

Частка 1. Рэлігійная дэмаграфія.

Тэрыторыя краіны складае 80154 квадратныя мілі, а насельніцтва – 9750200 чалавек.

Гістарычна склалася, што гэта тэрыторыя была арэнай як суіснавання, так і суперніцтва паміж праваслаўем і каталіцызмам, хоць адносіны між гэтымі канфесіямі цягам справаздачнага перыяду палепшыліся. Паводле апытанняў, блізу 50 адсоткаў беларусаў усведамляюць сябе вернікамі. Урад сцвярджае, што сярод усіх людзей, што спавядаюць розныя рэлігіі, прыкладна 80 адсоткаў належыць да БПЦ, 14 адсоткаў вызнаюць каталіцызм або прылічаюць сябе да рымска-каталіцкай царквы, 4 адсоткі адносяць сябе да ўсходніх груп, уключна крышнаіты, мусульмане, бахаісты, і 2 адсоткі складаюць пратэстанты. Паводле дзяржаўнага перапісу насельніцтва, яўрэйская супольнасць складае 0,4 адсоткі ўсяго насельніцтва (прыкладна 40 тысяч чалавек), аднак яўрэйскія суполкі заяўляюць, што ад 50 да 70 тысяч чалавек усведамляюць сябе іудзеямі. Існуюць таксама прыхаджане грэка-каталіцкай царквы і праваслаўных абшчын, што не ўваходзяць у БПЦ. Іншыя рэлігійныя меншасці ўключаюць крышнаітаў, індуістаў, бахаістаў, адвентыстаў сёмага дня, стараавераў, мусульман, іегавістаў, хрысціян веры апостальскай, кальвіністаў ды лютэран.

Паводле дадзеных Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў (КСРН), на 1 студзеня 2006 года існавала 3030 рэлігійных арганізацый, у тым ліку 2886 зарэгістраваных рэлігійных груп, 144 канфесійных арганізацый (кляштараў, таварыстваў, місіянераў і г.д.) і 25 рэлігійных канфесій і веравызнанняў. Сюды ўваходзілі 1349 беларускіх праваслаўных прыходаў, 972 пратэстанцкіх, 438 рымска-каталіцкіх, 45 іудзейскіх, 24 мусульманскіх, 33 стараверскіх, 13 грэка-каталіцкіх, 5 крышнаіцкіх і 5 бахаісцкіх абшчын, а таксама адна Армянская апостальская і адна лацінска-каталіцкая царква. Дакладныя лічбы зарэгістраваных евангелісцкіх, баптысцкіх і адвентысцкіх суполак недаступныя.

У 1989 годзе Беларусь была вызначана як экзархат Рускай праваслаўнай царквы і ўтворана БПЦ на чале з Патрыяршым Экзархам Мітрапалітам Філарэтам. На канец справаздачнага перыяду колькасць прыходаў па краіне складала блізу 1349. У краіне існуюць таксама іншыя праваслаўныя канфесіі, якія адчуваюць на сабе жорсткую дыскрымінацыю, не маючы магчымасці зарэгістравацца без згоды на тое БПЦ, яны фактычна знаходзяцца пад забаронай. Да такіх суполак адносяцца Беларуская аўтаномная праваслаўная царква (БАПЦ), Катакомбная праваслаўная царква, Ісцінная праваслаўная царква і Руская праваслаўная царква за мяжой.

У краіне налічвалася 438 рымска-каталіцкіх прыходаў, і сітуацыя з царквой у апошнія гады паляпшалася. 8 лютага 2005 года прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка і кардынал Свёнтак правялі сустрэчу і дамовіліся развіваць адносіны паміж уладамі і рымска-каталіцкай царквой. Пасля другой сустрэчы ў снежні 2005 года Лукашэнка прызнаў важную ролю каталіцкай царквы ў краіне і паабяцаў аказваць ёй падтрымку.

У 1989 годзе, напрыканцы савецкага перыяду, у краіне налічвалася прыкладна 120 тысяч грамадзян, якія ўсведамлялі сябе яўрэямі, у параўнанні з 40-70 тысячамі на канец справаздачнага перыяду. Прынамсі палова сённяшняга яўрэйскага насельніцтва пражывае ў Мінску або яго ваколіцах. Значная бальшыня

прадстаўнікоў яўрэйскага насельніцтва актыўна не практыкуе рэлігію. Сярод тых яўрэяў, што з'яўляюцца актыўнымі вернікамі, большыня належыць да рэфармісцкіх ды кансерватыўных іудзеяў. Існуюць таксама невялікія, але актыўныя Любавіцкія суполкі "Хабад".

Невялікая пакуль яшчэ колькасць прыхільнікаў пратэстанцкай веры працягвае расці. Пачынаючы з 1990 года, колькасць зарэгістраваных і незарэгістраваных пратэстанцкіх суполак павялічылася больш чым удвая. Зарэгістраваныя саюзы пяцідзесятнікаў і баптыстаў уяўляюць сабой дзве найбуйнейшыя пратэстанцкія арганізацыі.

Існуе шэраг прыходаў грэка-каталіцкай царквы, да якой калісьці належала прыкладна тры чвэрці насельніцтва краю, але якая, аднак, сур'ёзна пацярпела ад жорсткіх рэпрэсій у царскія і савецкія часы. Зробленая пасля аднаўлення ў 1991 годзе незалежнасці Беларусі спроба адрадзіць гэтую царкву, што прытрымліваецца ў набажэнстве праваслаўнага абраду, аднак падпарадкоўваецца Ватыкану, не мела вялікага поспеху ў сувязі з рашучым супрацівам з боку БПЦ.

Беларуская рэлігійная асацыяцыя мусульман з'яўляецца найбуйнейшым арганізаваным аб'яднаннем прыкладна трыццацітысячнага мусульманскага насельніцтва краіны. Духоўнае ўпраўленне мусульман, якое аддзялілася ад асацыяцыі ў 2002 годзе, заявіла, што ў ягоны склад уваходзіць прыкладна 200 чалавек. Некаторыя члены прыкладна дзесяцітысячнай татарскай этнічнай супольнасці, карані якой сыходзяць у адзіннаццатае стагоддзе, вызнаюць суніцкі іслам.

У краіне дзейнічаюць замежныя місіянеры і святары, якія прадстаўляюць заходнія і ўсходнія рэлігіі, аднак адсутнасць нарматыўных інструкцый для дзяржаўных чыноўнікаў аб тым, як правільна прымяняць пазнейшыя змены, унесеныя ў закон аб візах, прыводзіла да таго, што рашэнні па візавых пытаннях прымаліся чыноўнікамі хутчэй з абачлівасцю, чым у адпаведнасці з нязменнымі крытэрыямі.

Частка 2. Становішча са свабодай веравызнання

Прававая і палітычная база

Свабода веравызнання абвешчана Канстытуцыяй, тым не менш, дзяржава на практыцы абмяжоўвае гэта канстытуцыйнае права. Нягледзячы на тое, што выпраўленая ў 1996 годзе Канстытуцыя яшчэ раз пацвердзіла роўнасць усіх рэлігій і канфесій перад законам, яна ўсё ж дапускае агаворку пра тое, што адносіны паміж дзяржавай і рэлігійнымі арганізацыямі "рэгулююцца з улікам іх уплыву на фармаванне духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа". Рэгуляцыяй усіх рэлігійных пытанняў у рэспубліцы займаецца КСРН.

Насуперак пратэстам праваабарончых арганізацый, Еўрасаюза і мясцовых рэлігійных груп, у 2002 годзе прэзідэнт А.Лукашэнка сваім подпісам увёў у

дзеянне закон аб рэлігіі. Закон сцвярджае “вызначальную ролю праваслаўнай царквы ў гістарычным станаўленні і развіцці духоўных, культурных і дзяржаўных традыцый беларускага народа”, а таксама гістарычную важнасць каталіцызму, іудаізму, ісламу і евангелічна-лютэранскай царквы – канфесій, што звычайна прызнаюцца “традыцыйнымі” ў грамадстве. І ўсё ж ключавое значэнне адыграюць у гэтым спісе хутчэй сённяшнія інтарэсы. Паняцце “традыцыйныя вераванні”, спамянутае ў законе, не ўключае ў сябе рэлігійныя групы з глыбокімі гістарычнымі каранямі ў краіне, такія як беспапоўскія стараверскія і кальвіністкія абшчыны, што з’явіліся ўжо ў 17 стагоддзі.

Нягледзячы на тое, што закон дэкларуе намер гарантаваць свабоду веравызнання, ён утрымлівае цэлы шэраг надзвычай абмежавальных палажэнняў, што павышаюць узровень кантролю ўрада за дзейнасцю рэлігійных аб’яднанняў. Закон патрабуе, каб усе рэлігійныя суполкі папярэдне атрымалі дазвол урада на ўвоз і распаўсюджанне рэлігійнай літаратуры, забараняе замежнікам узначальваць рэлігійныя арганізацыі і пазбаўляе суполкі магчымасці ствараць духоўныя навучальныя ўстановы для падрыхтоўкі ўласных святароў. У дадатак, закон абмяжоўвае дзейнасць рэлігійных суполак тымі раёнамі, дзе яны зарэгістраваныя, і ўводзіць складаныя рэгістрацыйныя патрабаванні, якія цяжка выканаць многім як традыцыйным, так і нетрадыцыйным рэлігійным арганізацыям. Закон запатрабаваў таксама, каб усе зарэгістраваныя раней рэлігійныя групы прайшлі да 17 лістапада 2004 года перарэгістрацыю, і забараніў любую рэлігійную дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп.

Мясцовыя рэлігійныя арганізацыі працягвалі заклікаць да адмены па меншай меры часткі прынятага ў 2002 годзе закона. Пратэстанцкія суполкі накіравалі прэзідэнту Лукашэнку, у Нацыянальны сход, Савет міністраў і Канстытуцыйны суд петыцыі, заклікаючы да перагляду найбольш абмежавальных артыкулаў закона. Яны заявілі, што гэты закон не сумяшчальны з Канстытуцыяй і міжнароднымі стандартамі. Яны раскрытыкавалі артыкулы, што абмяжоўваюць дзейнасць рэлігійнай групы раёнам, у якім яна зарэгістраваная, складанасць у атрыманні дазволу на набажэнства ў грамадскіх месцах і вызначэнне ў прэамбуле закона БПЦ як царквы, што адыграе галоўную ролю і мае найбольшы ўплыў у краіне. На гэтыя петыцыі ўлады далі прэтэнцыйныя адказы, аднак закон не перагледзелі.

Закон 2002 года вызначае трохузроўневую структуру рэлігійных арганізацый: рэлігійныя суполкі, рэлігійныя аб’яднанні і рэспубліканскія рэлігійныя аб’яднанні. Рэлігійныя суполкі, ці мясцовыя пярвічныя рэлігійныя арганізацыі, павінны налічваць не менш як дваццаць членаў ва ўзросце не маладзей за 18 гадоў, што павінны пражываць у дадзенай мясцовасці. Рэлігійныя аб’яднанні мусяць складацца прынамсі з 10 суполак, прычым адна з іх павінна дзейнічаць у краіне па меншай меры 20 гадоў, і могуць быць заснаваныя толькі рэспубліканскімі рэлігійнымі аб’яднаннямі (на агульнанацыянальным узроўні). Рэспубліканскія рэлігійныя аб’яднанні ствараюцца толькі ў тым выпадку, калі актыўныя рэлігійныя суполкі маюцца ў бальшыні з 6 абласцей рэспублікі. Усе заяўкі на заснаванне

рэлігійных аб’яднанняў і рэспубліканскіх рэлігійных аб’яднанняў падаюцца ў КСРН.

КСРН дазволіў прайсці перарэгістрацыю шэрагу рэлігійных аб’яднанняў, якія былі створаны да прыняцця закона 2002 года, аднак яшчэ не перасягнулі дваццацігадовы рубеж. Для атрымання рэгістрацыі аб’яднанні павінны падаць спіс членаў свайго кіруючага органа з біяграфічнымі звесткамі, дакумент, што пацвярджае права размяшчэння ў пэўным месцы, і пратаколы ўстаноўчага сходу аб’яднання. Згодна з законам, аб’яднанні валодаюць выключным правам ствараць духоўныя навучальныя ўстановы, запрашаць замежных грамадзян для працы з рэлігійнымі групамі і ствараць кляштары ды манаскія аб’яднанні.

Папярэдне зарэгістраваныя рэлігійныя суполкі маглі перарэгістравацца, калі ў сваім складзе мелі сама меней як 10 членаў, у адрозненне ад 20, што былі патрэбныя паводле закона, прынятага ў 2002 годзе. Для рэгістрацыі суполка мусіць прадставіць спіс заснавальнікаў з указаннем іх імені, месца жыхарства, грамадзянства і асабістым подпісам, экземпляры статута, пратаколы ўстаноўчага з’езду і пасведчанне, што пацвярджае права суполкі на валоданне ці карыстанне любой маёмасцю, пералічанай у яе ўстаноўчых дакументах. Для тых суполак, якія вызнаюць рэлігіі, раней невядомыя ўладам, павінна быць пададзена інфармацыя пра гэтыя канфесіі. Заявы на рэгістрацыю разглядаюцца абласнымі выканаўчымі камітэтамі (аблвыканкамамі) і Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам (Мінгарвыканкамам).

Хоць закон і адмаўляе суполкам у праве ствараць навучальныя ўстановы, ён дазваляе ім адчыняць нядзельныя школы. Больш за тое, звычайна ўлады забяспечваюць патрэбы прадстаўнікоў розных рэлігій у дачыненні да розных рэлігійных святаў.

1 снежня 2005 года прэзідэнт выдаў указ, які вызваляе ўсе зарэгістраваныя рэлігійныя суполкі ад падаткаў на зямлю, на якой знаходзяцца будынкі, і на ўласнасць, што выкарыстоўваецца ў набажэнстве.

Пагадненне, заключанае ў 2003 годзе паміж БПЦ і ўрадам, гарантуе БПЦ самастойнасць у яе ўнутраных справах і свабоду ў правядзенні рэлігійных абрадаў і іншых дзеянняў, таксама як і права лічыць сябе ў асаблівых адносінах з дзяржавай. Пагадненне прызнае за БПЦ “уплыў на фармаванне духоўных, культурных і нацыянальных традыцый беларускага народа”. Пагадненне заклікае ўрад і БПЦ да супрацоўніцтва пры правядзенні сваёй палітыкі ў розных сферах, уключна ў адукацыі, развіцці і аховы культурнай спадчыны, а таксама бяспекі. Хоць у дакуменце і сцвярджаецца, што пагадненне не замахваецца на рэлігійныя свабоды іншых канфесій, у той самы час яно заклікае ўрад і БПЦ аб’явіць вайну неназваным “псеўдарэлігійным структурам, якія ўяўляюць небяспеку для асобы і грамадства”. Нягледзячы на шэраг падпісаных за апошнія некалькі гадоў палажэнняў аб супрацоўніцтве паміж БПЦ і рознымі ўрадавымі ўстановамі, роля БПЦ у дзейнасці дзяржаўных арганізацый, паводле наяўных звестак, застаецца нязначнай. І ўсё ж у

2004 годзе прэзідэнт Лукашэнка падкрэсліў нязменную важнасць БПЦ: “Я вельмі хацеў, каб наша праваслаўная царква не была выпхнута, выведзена за рамкі нашай дзяржавы. Я хацеў, каб наша праваслаўная царква была адным з інстытутаў нашай дзяржавы, адным з яе асноўных апірышчаў”.

У 2004 годзе Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці прадставіў БПЦ выключнае права на выкарыстанне ў яе назве слова “праваслаўны” і на выкарыстанне ў якасці сімвала выявы крыжа Ефрасінні Полацкай, святой заступніцы Беларусі. Гэтыя захады можна лічыць наступнымі крокамі ва ўмацаванні становішча БПЦ як адзіна дазволенай праваслаўнай веры.

Улады лічаць усе групы, што, па іх меркаваннях, не адносяцца да традыцыйных рэлігій, “нетрадыцыйнымі”, прычым службовыя асобы і дзяржаўныя СМІ ў дачыненні да апошніх шырока выкарыстоўваюць тэрмін “секта”, хоць ён і не з’яўляецца афіцыйным абазначэннем.

Агульнанацыянальнымі святамі з’яўляюцца заходні і праваслаўны Вялікдзень і Каляды, тым не менш, яны не аказваюць негатыўны ўплыў на якую-кольвечы з рэлігійных суполак.

Паводле інфармацыі КСРН за 2004 год, з 2780 рэлігійных суполак, якім было трэба прайсці перарэгістрацыю, паспяхова прайшлі яе 2676. Сярод 140 рэлігійных аб’яднанняў і рэспубліканскіх аб’яднанняў, якія таксама павінны былі перарэгістравацца, 128 прайшлі працэдуру. КСРН засведчыў, што тыя 12 неперарэгістраваных рэлігійных аб’яднанняў самаліквідаваліся з прычыны недахопу членаў ды нізкай актыўнасці. Сярод 104 рэлігійных суполак, што не прайшлі перарэгістрацыю, 83 самаліквідаваліся. Прадстаўнікі шэрагу рэлігійных груп адзначылі, што КСРН аказваў істотную дапамогу цягам усяго працэсу. Паводле КСРН, астатнія 20 “не змаглі прайсці перарэгістрацыю па прычыне надзвычай сур’ёзных парушэнняў”. Усе 20 суполак, якім было адмоўлена ў перарэгістрацыі, прадстаўляюць рэлігіі, якія ўрад лічыць “нетрадыцыйнымі”.

Насуперак многім чаканням, КСРН заявіў, што аблвыканкамы і Мінгарвыканкам перарэгістравалі 99,3 адсоткі тых рэлігійных суполак, якія не самаліквідаваліся, і што ўлады не выкарыстоўвалі перарэгістрацыю з мэтай масавых рэлігійных рэпрэсій, як чакалася. Але нават пры гэтым перарэгістрацыя сама па сабе не гарантуе свабоды веравызнання, а КСРН працягваў адмаўляць некаторым рэлігійным групам у перарэгістрацыі. Прычыны адмовы пры гэтым былі абумоўленыя палажэннямі закона, але відавочна адвольнае іх прымяненне прыводзіла да абмежавання свабоды веравызнання.

21 верасня 2005 года суддзя Мінскага гарадскога суда Ала Карпікава анулявала рэгістрацыю адзінай у краіне суполкі Беларускай евангельскай царквы з-за адсутнасці юрыдычнага адраса і з-за таго, што ў яе склад уваходзіла менш за патрэбных 20 членаў, неабходных для рэгістрацыі. Пастар Эрнест Сабіла падаў у сувязі з такім рашэннем апеляцыю і адмовіўся прадпрымаць крокі па ліквідацыі

царквы, у тым ліку выплату неабходных, прадугледжаных законам грошай на яе закрыццё. Да таго, 22 жніўня 2005 года і 27 чэрвеня 2006 года Мінскі гарадскі суд пазбавіў рэгістрацыі евангелісцкую рэфармісцкую царкву ды баптысцкую рэфармісцкую царкву Запавет Хрыста адпаведна за адсутнасць юрыдычнага адраса.

9 лістапада 2005 года ўлады адмовіліся зарэгістраваць вясковы прыход Рускай праваслаўнай царквы за мяжой пасля нядаўняга канфлікту з мясцовай епархіяй Маскоўскага патрыярхата. Праваслаўныя суполкі, якія не абапіраюцца на Маскву, могуць прайсці дзяржаўную рэгістрацыю толькі з дазволу біскупа Маскоўскага патрыярхата, які замест гэтага заклікаў вясковых прыхаджан праўляць набажэнства ў тамтэйшай царкве, якая належыць Маскоўскаму патрыярхату. Вясковыя прыхаджане адмовіліся і былі ў 2005 годзе аштрафаваныя за правядзенне набажэнства ў прыватных дамах.

У 2004 годзе яўрэйскай праваабарончай недзяржаўнай арганізацыі “Аб’яднанне камітэтаў у абарону яўрэяў краін былога СССР” (UCSJ) было адмоўлена ў рэгістрацыі ў сувязі з тым, што некаторыя дакументы былі прадстаўлены са спазненнем. UCSJ абскардзіла адмову ў Вярхоўным судзе, але па тэхнічных прычынах суд адхіліў разгляд справы. Для UCSJ не засталося іншага выйсця, як закрыцца. Аднак дзеянні ўладаў не далі магчымасці UCSJ афіцыйна спыніць сваю дзейнасць. Следам за адмовай у перарэгістрацыі ўлады замарозілі банкаўскія рахункі арганізацыі, пазбавіўшы яе магчымасці заплаціць за арэнду памяшканняў, выплаціць падаткі і выдаць выхадную дапамогу сваім супрацоўнікам. У сярэдзіне чэрвеня 2005 года UCSJ урэшце атрымала магчымасць доступу да сваіх банкаўскіх рахункаў і здолела заплаціць за арэнду і выдаць заробкі супрацоўнікам. Пасля закрыцця UCSJ больш не звярталася па рэгістрацыю і заставалася незарэгістраванай да канца перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай.

Паводле прынятага ў 2001 годзе палажэння, урад патрабуе, каб арганізацыя падавала ў КСРН пісьмовую заяўку на запрашэнне ў краіну замежнага святара з указаннем часу знаходжання і мэты візіту. Нават калі візіт носіць нерэлігійны характар і звязаны, напрыклад, з дабрачыннай дзейнасцю, прадстаўнік павінен атрымаць візу і дазвол ад КСРН. Камітэт мае 20 дзён для адказу, прычым абскарджанне яго рашэння не прадугледжана. Заканадаўства забараняе ў краіне “падрыўную дзейнасць” замежных арганізацый і накладае забарону на стварэнне аддзелаў замежных арганізацый, дзейнасць якіх узбуджае “нацыянальную, рэлігійную і расавую варожасць” або можа “аказаць негатыўны ўплыў на фізічнае і духоўнае здароўе народа”.

Абмежаванні свабоды веравызнання

Уладамі як актыўным, так і пасіўным чынам абмяжоўвалася свабода веравызнання. Урад прымаў законы, што абмяжоўваюць свабоду набажэнства, слова і сходаў. Урад таксама ў недастатковай ступені асуджаў акты рэлігійнай нячуласці і нецярпімасці. Некаторыя з 2886 зарэгістраваных рэлігійных суполак прайшлі рэгістрацыю толькі на мясцовым узроўні, што прывяло да абмежавання іх правоў.

Некаторыя рэлігійныя групы, афіцыйна зарэгістраваныя і незарэгістраваныя, сутыкнуліся са складанасцямі ў пытаннях арэнды і набыцця нерухомай маёмасці для абсталявання памяшканняў для набажэнства, пабудовы цэркваў (напрыклад, грэка-каталікі і пратэстанцкія суполкі) або адкрыцця духоўнай семінарыі.

Многія рэлігійныя групы сутыкнуліся з праблемамі пры выкарыстанні жылога фонду ў рэлігійных мэтах. Паводле інфармацыі ўрада, закон дазваляе выкарыстоўваць маёмасць толькі пасля яе выключэння з жылога фонду. Жыллёвы кодэкс прадугледжвае выкарыстанне такой маёмасці для іншых мэт з дазволу мясцовых выканаўчых і адміністратыўных органаў. У выніку шэраг пратэстанцкіх цэркваў і іншыя нетрадыцыйныя канфесіі апынуліся фактычна ў замкнёным коле: ім не даюць дазвол на выключэнне сваёй уласнасці з жылога фонду для выкарыстання яе ў рэлігійных мэтах таму, што яны не з’яўляюцца зарэгістраванымі рэлігійнымі групамі, але, не маючы юрыдычнага адраса, яны не могуць прайсці рэгістрацыю. Такія групы часта вымушаны сустракацца нелегальна або ў дамах сваіх прыхільнікаў.

Царква Новае жыццё ў Мінску, член Саюза цэркваў поўнага Евангелля, можа быць вымушана спыніць сваю дзейнасць, паколькі ўлады адмовіліся рэгістраваць прыход у кароўніку, які знаходзіцца ва ўласнасці царквы і які яна імкнецца выкарыстоўваць як памяшканне для набажэнстваў. Царква Новае жыццё, вядомая як “царква ў кароўніку”, набыла хлеў і навакольную маёмасць чатыры гады таму. Паства пачала збірацца там пасля таго, як атрымала адмову на арэнду якога-кольвечы іншага памяшкання. Аднак мясцовыя ўлады не далі царкве дазволу на пераабсталяванне кароўніка тыкім чынам, каб будынак мог быць зарэгістраваны, і не дазволілі прыхаджанам сустракацца ў будынку, якім ён ёсць цяпер. Таму царква не мела месца, прыдатнага для рэгістрацыі, што зрабіла любую яе дзейнасць нелегальнай. Пастар і іншыя лідэры царквы атрымалі вялікія штрафы за адпраўленне нелегальных набажэнстваў, бо тэхнічна парушылі Закон аб сходах. У той самы час улады далі дазвол суполке БПЦ бесперашкодна сустракацца ў пераабсталяваным вагоне цягніка на адлегласці менш за мілю ад іх.

30 жніўня 2005 года ўлады загадалі царкве Новае жыццё вызваліць кароўнік і прадаць яго мясцовым уладам. Царква апратэставала рашэнне, аднак суды адхілілі апеляцыю і вынеслі царкве яшчэ два афіцыйныя папярэджанні. 17 лістапада 2005 года царква падала сваю трэцюю заяўку на рэгістрацыю па адрасе былога кароўніка, выкарыстаўшы новы тэхнічны пашпарт (рэгістрацыйны дакумент), атрыманы ад мясцовых уладаў, у якім хлеў быў перайменаваны ў “будынак, прыстасаваны для рэлігійных мэтаў”. Праз тыдзень, аднак, мясцовыя ўлады адхілілі заяўку царквы, анулявалі новы пашпарт і пазней звольнілі таго супрацоўніка, які выдаў яго царкве з фармулёўкай “за незаконную выдачу пашпарта”. 22 чэрвеня 2006 года царква Новае жыццё апратэставала рашэнне гарадскіх уладаў, якія насільна прымушалі яе прадаць кароўнік. На канец справаздачнага перыяду справа яшчэ не была разгледжана.

Мінская суполка Свядомасці Крышны (Харэ Крышна), што налічвае тысячу членаў, таксама сутыкнулася з праблемай забароны сходаў і рабіла спробы зарэгістраваць маёмасць, якой ужо валодала да таго. Мясцовыя ўлады адмовіліся рэгістраваць крышнаіцкую суполку ў будынку, які быў набыты ёй у 1990 годзе і з таго часу выкарыстоўваўся як месца адпраўлення культу, патлумачыўшы тым, што будынак прыстасаваны толькі для выкарыстання ў якасці жылога памяшкання. Пачынаючы з 2004 года, суполка Харэ Крышна атрымала ад мясцовых улад ужо 6 папярэджанняў за тое, што ладзіла сустрэчы ў будынку, дзе не была зарэгістраваная. Мінская суполка Свядомасці Крышны падала апеляцыю ў Камісію па правах чалавека пры ААН, перашкодзіўшы такім чынам ураду закрыць суполку. У жніўні 2005 года Камісія парэкамендавала ўладам "аднавіць правы" суполкі ў дзевяностадзённы перыяд. На канец справаздачнага перыяду ўлады не падпарадкаваліся рэкамендацыям, выказаным Камісіяй па правах чалавека.

Хоць царква Новага пакалення ў Баранавічах і здолела перарэгістравацца, яна, паводле інфармацыйнага рэсурсу "Форум -18", зведала праблемы з пошукам месца для правядзення набажэнства. У 1997 годзе суполка набыла складское памяшканне з мэтай ператварыць яго ў царкву, аднак улады адмовілі ў дазволе на пераабсталяванне будынка, змену формы рэгістрацыі склада або на права царквы на валоданне зямлёй, на якой стаіць будынак.

За справаздачны перыяд многія традыцыйныя і нетрадыцыйныя рэлігійныя групы па-ранейшаму сутыкаліся з праблемамі пры набыцці маёмасці ва ўласнасць або пры рэгістрацыі той маёмасці, якой яны ўжо валодалі да таго, у сувязі са спробамі ўладаў перашкодзіць гэтым групам ў стварэнні іх культавых месцаў.

Мінская суполка Свядомасці Крышны знайшла шэраг юрыдычных адрасоў для арэнды, аднак уладальнікі скасавалі свае дамовы пад уціскам з боку ўлад. Суполка адшукала іншы юрыдычны адрас і падала дакументы на рэгістрацыю, але ўлады зноў адказалі адмовай.

Пратэстанцкая царква Святло свету, што была перарэгістравана ў 2004 годзе, працягвала зазнаваць складанасці пры пошуку ў нежылым фондзе ўхваленае дзяржавай месца для набажэнстваў. Пачынаючы з 2002 года, яна губляла свае памяшканні чатыры разы. Пасля таго, як яе арэндная дамова скончылася ў кастрычніку 2005 года, царква арандавала пакой у іншым офісным будынку. Праз некалькі дзён уладальнікануляваў арэндную дамову з-за ўціску ўладаў.

Пастанова ўрада прадугледжвае канкрэтныя меры па забеспячэнні грамадскага парадку і бяспекі пры правядзенні масавых грамадскіх мерапрыемстваў. Адміністрацыя некаторых грамадскіх аб'ектаў, спасылаючыся на гэтую пастанову, скасавала рэлігійным групам арэндныя дамовы на выкарыстанне сваіх аб'ектаў або адмовіла ў іх падаўжэнні. За справаздачны перыяд было практычна немагчыма для рэлігійных груп арэндаваць памяшканне на грамадскіх аб'ектах для правядзення сходаў.

Паводле “Форума-18”, 31 сакавіка 2006 года Мінгарвыканкам не дазволіў мясцовай суполцы яўрэяў-хасідаў правесці святкаванне Песаха у дзяржаўным Палацы дзяцей і моладзі. Адміністрацыя заявіла, што рэлігійнае мерапрыемства не можа адбывацца ў месцы частага збору дзяцей. Суполка вымушана была адзначыць свята ў кафетэрыі, які мог змясціць толькі прыкладна 10 адсоткаў з запрошаных гасцей.

Згодна інфармацыі “Форума-18”, у 2004 годзе мінскія гарадскія ўлады адхілілі заяўку Кальвінісцкай рэфармісцкай царквы на правядзенне міжнароднай канферэнцыі, прысвечанай 450-ай гадавіне заснавання царквы ў краіне. Паводле наяўных звестак, мінскія гарадскія ўлады паведамілі царкве пра тое, што яна не мае права праводзіць міжнародную канферэнцыю, паколькі не зарэгістравана як рэспубліканскае рэлігійнае аб’яднанне, нават не зважаючы на тое, што закон 2002 года дазваляе рэлігійным арганізацыям запрашаць іншаземцаў для ўдзелу ў сходах, паломніцтвах і іншых мерапрыемствах.

За справаздачны перыяд не мелася паведамленняў пра накладанне штрафаў на пратэстанцкія групы за іх ухіленне ад уплаты падаткаў з дапамогі, што вылучалася абяздоленым сем’ям і асобным людзям.

На працягу перыяду, ахопленага гэтай справаздачай, урад назіраў за міралюбнымі рэлігійнымі меншасцямі, з асаблівай увагай да тых, якія маглі расцэньвацца як “іншаземныя” або “культы”. 27 чэрвеня 2005 года старшыня Гомельскага абласнога аддзялення КСРН паведаміў прэсе, што абласныя ўлады сфармавалі камісіі для назірання за дзейнасцю рэлігійных суполак. Камісіі, якія складаліся з членаў мясцовых выканаўчых і праваахоўных органаў, падатковых інспектараў і прадстаўнікоў грамадскасці, павінны былі праводзіць у жыццё закон аб рэлігіі, дапамагаць традыцыйным канфесіям і процістаяць нелегальнай місіянерскай дзейнасці. Галоўнай мэтай з’яўлялася забеспячэнне падпарадкавання закону усіх канфесій, у тым ліку і БПЦ.

Паводле інфармацыйнага онлайнавага агенцтва “Інтэрфакс”, Праваслаўны цэнтр Іосіфа Валоцкага апошнія 5 гадоў збіраў інфармацыю пра разнастайныя “секты”, што дзейнічаюць у краіне. Цэнтр меў бібліятэку сектанцкай літаратуры, запісы казаняў, калекцыю фільмаў, прысвечаных сектам, ды спіс сродкаў масавай інфармацыі, якія рэгулярна распаўсюджвалі сектанцкую літаратуру.

Згодна са службай навін “Форум -18”, у 2003 годзе Уладзімір Ламека, намеснік старшыні КСРН, загадаў мясцовым уладам узмацніць кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый, рэгулярна наведваць набажэнствы і сустракацца з рэлігійнымі лідэрамі, а таксама пастаянна правяраць і спыняць дзейнасць незарэгістраваных рэлігійных груп. Ламека спаслаўся на “грубыя парушэнні” закона ў Нясвіжы “пераважна пратэстанцкімі суполкамі” і заклікаў мясцовых службовых асоб актывізаваць намаганні па “ўрэгуляванні этна-канфесійнай сітуацыі”. Акрамя таго, Ламека даў указанне мясцовым чыноўнікам не дазваляць асноўнай арганізацыі польскай меншасці ў краіне карыстацца маёмасцю рымска-каталіцкай царквы і праводзіць “сістэматычную працу” з мясцовымі каталіцкімі

лідэрамі, каб упэўніцца, што замежныя каталіцкія рэлігійныя дзеячы прапаведуюць на беларускай або рускай мове. Пасля такога загаду Ламекі прадстаўнікі суполак Саюза евангелісцкіх хрысціян і баптыстаў скардзіліся, што школьныя настаўнікі пачалі апытваць дзяцей на прадмет іх прыналежнасці да гэтых цэркваў, пра іх удзел у рэлігійных абрадах з мэтай выяўлення тых вучняў, што маюць дачыненне да пратэстанцкай рэлігійнай дзейнасці. На працягу справаздачнага перыяду такія апытанні, па звестках, працягваліся, хоць і ў меншай ступені.

У 2004 годзе прэзідэнт Лукашэнка выступіў у абарону той сітуацыі, якая склалася сёння, і супраць "іншаземных" рэлігій: "Некаторыя члены апазіцыі, падбухтораныя замежнымі паслугачамі, робяць правакацыйныя прапановы аб звужэнні сферы дзейнасці традыцыйных рэлігій, у першую чаргу праваслаўнай царквы, на карысць разнастайных сект і рэлігій, не традыцыйных для гэтай краіны".

19 траўня 2006 года, паведамляе "Форум-18", улады аказалі ціск на пастара пяцідзесятнікаў Аксану Гаўрыленка, каб яна сама звольнілася з пасады школьнага настаўніка, пасля таго як яна паскардзілася на лекцыю пра шкоду "сект", у тым ліку баптыстаў і пяцідзесятнікаў, што прачытаў вучням праваслаўны святар. Паводле паведамлення, улады не ўзнавілі Гаўрыленку на працы, аднак папрасілі святара ўстрымацца ад шальмавання пратэстанцкіх цэркваў.

На працягу перыяду, ахопленага дадзенай справаздачай, урад прадпрымаў крокі, каб перасцерагчы насельніцтва ад новых рэлігійных груп, якія ўспрымаюцца як "іншаземныя" або як "культы", і стрымаць прырост апошніх. 9 лістапада 2005 года старшыня КСРН Станіслаў Буко абвясціў, што ўлады не будуць рэгістраваць дэструктыўныя рэлігійныя секты, забароненыя законам. Ён запэўніў, што ў краіне ў справаздачны перыяд такія секты не дзейнічалі, аднак асобы, што прымалі ўдзел у дзейнасці, якая нагадвала па характары дзейнасць такіх сект, пільна адсочваліся. Гэта заява была зроблена пасля сустрэчы 3 лістапада 2005 года БПЦ, Міністэрства адукацыі і КСРН для абмеркавання пытанняў абароны моладзі ад уплыву "гэтых дэструктыўных псеўдарэлігій". У сакавіку 2005 года Уладзімір Макараў, кіраўнік аддзела інфармацыі Міністэрства абароны, заклікаў беларускіх праваслаўных святароў змагацца супраць распаўсюджання "дэструктыўных сект" і пашыраць праваслаўе.

Улады заявілі 20 траўня 2005 года, што колькасць сект і сепаратыстаў скарацілася, паколькі грамадзяне згубілі цікавасць да нетрадыцыйныха веравызнанняў. Улады, у тым ліку праваахоўныя органы, прымалі меры па папярэджанні распаўсюджання многіх "дэструктыўных культаў", якія распачалі сваю дзейнасць у перыяд з 1992 па 1996 гады. Міністэрства юстыцыі абвясціла па-за законам 24 рэлігійныя арганізацыі, якія дзейнічалі ў статусе грамадскіх аб'яднанняў, аднак такія групы, як царква Луны і царква саенталогіі, функцыянуюць у краіне да гэтага часу. Улады сцвярджалі, што гэтыя групы, асабліва царква саенталогіі, распаўсюджвалі рэлігійную прапаганду на семінарах і лекцыях, выкарыстоўвалі маніпулятыўныя метады, падобныя да тых, якімі карыстаюцца псіхатэрапеўты і псіхіятры, і павінны

былі лічыцца “камерцыйнымі” культамі або маркетынгавымі сістэмамі для атрымання прыбытку.

Тэарэтычна грамадзянам не забараняецца звяртаць у сваю веру і дазваляецца свабодна гаварыць пра свае рэлігійныя перакананні; тым не менш, улады часта ўмешваліся або каралі людзей, што звярталі ў веру ад імя некаторых зарэгістраваных і незарэгістраваных рэлігійных груп. Улады рэгулявалі кожны аспект звароту ў веру і распаўсюджання літаратуры: хто можа займацца гэтым, што можа быць зроблена, калі групы могуць удзельнічаць і дзе яны павінны дзейнічаць. Урад працягваў праводзіць у жыццё пастанову Савета Міністраў ад 1995 года, што рэгулюе дзейнасць духоўных асоб, таксама як і дырэктыву Савета Міністраў ад 1997 года, якая дазваляе выкладанне рэлігіі ў моладзевых лагерах, створаных зарэгістраванымі рэлігійнымі групамі.

Раней улады праследавалі, штрафавалі і затрымлівалі прадстаўнікоў Харэ Крышна за незаконнае распаўсюджванне рэлігійнай літаратуры. Пасля таго, як мінскія гарадскія ўлады адмаўлялі суполцы крышнаітаў на іх просьбу дазволіць распаўсюджваць у горадзе рэлігійныя матэрыялы, суполка вырашыла спыніць продаж літаратуры ў перыяд, ахоплены дадзенай справаздачай. 15 лістапада 2005 года ўлады канфіскавалі рэлігійную літаратуру, у тым ліку копіі Новага Запавету, у бібліятэцы, арганізаванай на вуліцы, што належала незарэгістраванаму Савету баптысцкіх цэркваў у Бабруйску.

Замежным місіянерам не дазваляецца прымаць удзел у рэлігійнай дзейнасці па-за сценамі ўстаноў, якія іх запрасілі. Закон патрабуе, каб такія дзеячы мелі на руках гадавыя візы на шматразовы ўезд з дазволам займацца “духоўнай дзейнасцю”. Рэлігійныя дзеячы, нават тыя, што даўно пражываюць у краіне, па-ранейшаму мелі складанасці з атрыманнем віз. Нават місіянеры, якія дзейнічаюць законна і адкрыта, маючы місіянерскую візу, часта церпяць нападкі з боку ўладаў, асабліва ў тым выпадку, калі яны прыбываюць з Захаду. Назіральнікі выказалі сваю занепакоенасць тым, што адсутнасць у чыноўнікаў унармаваных дзяржаўных дакументаў, якія тлумачаць, як правільна прымяняць папярэднія змены ў законе аб візах, можа перашкодзіць гэтым місіянерам знаходзіцца і працаваць ў краіне.

Хоць і не існавала паведамленняў пра адмову ў візе або пра ануляванне візы для заходніх місіянераў, улады, паводле наяўных звестак, прымушалі чакаць да апошняй хвіліны працягнення візы або вымушалі іх несці дадатковыя выдаткі на паездку ў Літву для атрымання кароткатэрміновых віз, каб не губляць час у чаканні выдачы місіянерскай візы. Прынамсі адзін пратэстанцкі місіянер і яго мясцовыя калегі былі некалькі разоў выкліканы ды распытаны пра крыніцы фінансавання і выкарыстанне грошай, не зважаючы на той факт, што прапаведнік знаходзіўся ў краіне больш за пяць гадоў і не меў ніякіх праблем з візай і законам.

Атрыманне віз рэлігійнымі работнікамі часта ператвараецца ў доўгую бюракратычную працэдуру. Органы ўнутраных спраў могуць выдвараць замежных святароў з краіны, адмовіўшы ім у працягненні рэгістрацыі або не выдаўшы дазвол

на часовае знаходжанне. Гэтыя органы могуць прымаць рашэнне аб высылцы самастойна або на падставе рэкамендацый аддзелаў па справах рэлігій, аблвыканкамаў ці ўпраўлення па справах рэлігій Мінгарвыканкама.

22 снежня 2005 года ўлады адмовіліся працягнуць візу двум польскім ксяндзам і запатрабавалі, каб тыя пакінулі краіну. Айцец Роберт Кржывіцкі, які працаваў у Барысаве больш як дзесяць гадоў, быў высланы за ўдзел у "нерэлігійнай" дзейнасці. На звароты ў КСРН кіраўнік камітэта адказаў, што святароў у прыходы прызначае каталіцкая царква і што "дзяржава не ўмешваецца ў дзейнасць рэлігійных арганізацый".

У газеце "Знамя юности" за 2004 год быў апублікаваны артыкул, які называе царкву уніфікацыі, царкву Хрыста ды царкву саенталогіі аднымі з самых небяспечных "сект" у краіне. Артыкул у дзяржаўнай газеце "Минский курьер" за 2004 год утрымліваў крытыку прыхільнікаў Царквы уніфікацыі і Харэ Крышна. У артыкуле сцвярджалася, што яшчэ ў 1997 годзе Харэ Крышна была вызначана як "дэструктыўная таталітарная секта". Як паведамляюць прадстаўнікі гэтай суполкі, улады ніколі не давалі такога вызначэння. Падчас сустрэчы з крышнаітамі аўтар-журналіст прызнаўся, што такія лжывыя звесткі былі прадстаўлены беларускім Камітэтам дзяржаўнай бяспекі (КДБ), што пазней пацвердзіў і сам КДБ.

Міністэрства адукацыі працягвала выкарыстоўваць падручнік "Чалавек, грамадства, дзяржава", у якім суполкі пратэстантаў і Харэ Крышна называюцца "сектамі", нават не зважаючы на пратэсты рэлігійных груп. Правёўшы аналіз кнігі, КСРН і Міністэрства адукацыі прыйшлі да высновы, што слова "секта" з'яўляецца навуковым і не навешвае на Харэ Крышна ці пратэстантаў ярлык антысацыяльных арганізацый.

Лідэры пратэстанцкіх суполак таксама выступалі супраць мовы падручніка "Асновы бяспекі жыццядзейнасці" як наўмысна прадузятай у адносінах да пратэстантаў, асабліва ў раздзеле пад назвай "Беражыцеся сект". Раздзел уключае параграф, які расказвае вучням пра такія "секты", як адвентысты сёмага дня, царква Марыі, Белае брацтва і Сведкі Іеговы. У студзені 2005 года пратэстанцкія лідэры накіравалі ліст пратэсту прэзідэнту, лідэрам Нацыянальнага сходу, у КСРН і Міністэрства адукацыі. КСРН азнаёміўся з заявай і паведаміў, што ў кнізе не мелася парушэння правоў пратэстантаў.

Хоць урад сам і не прадпрымаў заўважных крокаў па спыненні продажу ксенафобскай літаратуры ў "Праваслаўнай кнізе" і іншых месцах, ён асудзіў незалежную газету за тое, што яна перадрукавала карыкатуры на ісламскага прарока, якія ўпершыню з'явіліся ў дацкай газеце ў 2005 годзе. Урад выкарыстаў гэты інцыдэнт як падставу для закрыцця апазіцыйнай газеты і для ўзбуджэння крымінальнай справы супраць яе рэдактара.

У 2004 годзе падчас святкавання праваслаўнага Вялікадня, якое трансалявалася беларускім нацыянальным тэлебачаннем, святары БПЦ, паводле наяўных звестак,

дапусцілі шэраг антыкаталіцкіх выказванняў. Рымска-каталіцкая царква таксама выказала занепакоенасць фактамі продажу антыкаталіцкай літаратуры ў кіёсках і на мерапрыемствах, арганізаваных БПЦ.

У справаздачны перыяд мела месца абмежаваная рэстытуцыя рэлігійнай уласнасці. Для рэстытуцыі ўласнасці, захопленай ці экспрапрыяванай пры Савецкай уладзе і падчас нацысцкай акупацыі, не існуе заканадаўчай базы, закон таксама абмяжоўвае рэстытуцыю ўласнасці, якая выкарыстоўваецца ў культурных і асветніцкіх мэтах. Больш за тое, урад не вяртае будынкі, калі для гэтага патрэбна перасяленне іхніх цяперашніх жыхароў. Многія былыя сінагогі ў Мінску выкарыстоўваліся ў якасці тэатраў, музеяў, спартовых комплексаў і піўной, на бальшыню просьбаў яўрэйскай супольнасці вярнуць сінагогі прыходзілі адмовы. За справаздачны перыяд яўрэйскія суполкі не рабілі заяўку на вяртанне будынкаў ці любой іншай нерухомай маёмасці. Яўрэйскія суполкі шукалі магчымасць вярнуць свае культурныя артэфакты, кнігі, асабліва Торы, што знаходзяцца ў музеях, аднак так і не атрымалі ніводнай з рэчаў. Некаторыя чыноўнікі ў прыватнай гутарцы выказваліся ў падтрымку яўрэйскіх лідэраў і ўхвалялі іх ініцыятыву.

Каталіцкая суполка ў Мінску запатрабавала вяртання старажытнага касцёла і кляштара, што знаходзяцца ў цэнтры горада. У будынку сёння размяшчаецца дзяржаўны архіў. Урад выразіў гатоўнасць вярнуць касцёл, аднак толькі пасля таго, як будзе знойдзена новае памяшканне і фінансаванне для перавозкі архіваў. Згодна незалежнай службы навінаў БелаПАН, у лютым 2006 года старшыня КСРН Леанід Гуляка сказаў вернікам, што пакуль дзяржава не мае сродкаў на пабудову новага памяшкання для размяшчэння архіваў, касцёл і кляштар не могуць быць перададзены назад вернікам. У Гродна ўлады вярнулі рымска-каталіцкай царкве 14 будынкаў кляштараў.

У 2004 годзе па распараджэнні Міністэрства адукацыі Беларускі дзяржаўны універсітэт (БДУ) зачыніў Міжнародны гуманітарны інстытут (МГІ), што з’яўляўся самастойнай установай адукацыі пры БДУ і адзінай вышэйшай навучальнай установай, дзе выкладаўся іудаізм. Праграма па вывучэнні іудаізму ўсё яшчэ захоўвалася як аўтаномная частка вучэбнага плана БДУ да таго, як была паглынута ў верасні 2005 года факультэтам міжнародных адносін.

Паводле сведчанняў КСРН, сам камітэт рэагуе на розныя публічныя праявы ксенафобіі, уведамляючы пры гэтым адпаведныя дзяржаўныя органы, якія абавязаны ўзбуджаць судовыя справы ў дачыненні да асоб, што дапусцілі гэта, аднак за справаздачны перыяд падобных іскаў не фіксавалася.

Замахі на свабоду веравызнання

За справаздачны перыяд урад часта прымаў меры, што абмяжоўвалі свабоду веравызнання шэрагу рэлігійных груп.

Некаторыя замахі на свабоду рэлігіі паўсталі на грунце больш агульных законаў, якія абмяжоўваюць асноўныя грамадзянскія свабоды. КСРН абараняў апошнія, прынятыя ўрадам меры супраць рэлігійных груп у сваім адказе на даклад Дзярждэпартамента ЗША "Справаздача аб свабодзе веравызнання ў краінах свету за 2005 год": "Санкцыі супраць прадстаўнікоў рэлігійных аб'яднанняў звязаны з парушэннямі закона, а не накіраваны на абмежаванне свабоды веравызнання".

Найбольш тыповае абвінавачванне супраць рэлігійных лідэраў – гэта арганізацыя ці прадстаўленне памяшкання для недазволеных мітынгаў, абмежаванне, якое вынікае з закона, што абмяжоўвае свабоду сходаў. Паводле "Форума-18", тым не менш, першы раз за апошнія 20 гадоў улады пазбавілі чалавека волі за правядзенне рэлігійнай службы. 3 сакавіка 2006 года Мінскі раённы суд прысудзіў пастару баптысцкай царквы Запавет Хрыста Рыгору Вязоўскаму 10 сутак зняволення за правядзенне 5 лютага 2006 года несанкцыянаванай рэлігійнай службы. 25 лістапада 2005 года ўлады вынеслі яму папярэджанне за нібыта правядзенне незаконнага набажэнства ў прыватным доме ў Мінску. Акрамя таго, царква атрымала 3 папярэджанні за адсутнасць зарэгістраванага юрыдычнага адраса. Біскуп пяцідзесятнікаў Сяргей Цвор сутыкнуўся з тымі самымі абвінавачваннямі, але, па словах пастара, абвінавачванні былі зняты ў сувязі з тэхнічнымі памылкамі, зробленымі праваахоўнымі органамі, якія высоўвалі абвінавачванні ў яго адрас.

24 сакавіка 2006 года ўлады прыгаварылі праваахоўніка Сяргея Шаўцова да 10 сутак турэмнага зняволення за правядзенне несанкцыянаванага міжканфесійнага семінара ў прыватнай кавярні. У апошні дзень трохдзённага семінара міліцыя штурмам узяла кавярню і затрымала яго, бо мерапрыемства быццам бы ішло ў разрэз з законам.

Паводле інфармацыі "Форума-18", у чэрвені 2005 года ўлады папярэдзілі святара Рускай праваслаўнай царквы за мяжой Леаніда Пляца, што ён можа апынуцца ў пастарунку або быць аштрафаваным на вялікую суму за ажыццяўленне "незаконнай рэлігійнай дзейнасці". З моманту адмовы ў рэгістрацыі Рускай праваслаўнай царкве за мяжой любая яе дзейнасць, акрамя малых сходаў у прыватных дамах, інтэрпрэтуецца як "незаконная рэлігійная дзейнасць".

Улады спаганялі штрафы з пратэстантаў і прадстаўнікоў праваслаўных рэлігійных суполак, што не належаць да БПЦ, за арганізацыю і правядзенне рэлігійнай службы і за ажыццяўленне несанкцыянаванай рэлігійнай дзейнасці. Паводле інфармацыі КСРН, прысуды за такія парушэнні базіраваліся на абвінавачваннях у парушэнні грамадскага парадку або ў незаконных сходах без атрымання папярэдняга дазволу. Закон дазваляе асобам збірацца для малітвы ў прыватных дамах, аднак накладае абмежаванні на правядзенне рытуалаў, абрадаў ды цырымоній у такіх памяшканнях і патрабуе папярэдні дазвол з боку мясцовых чыноўнікаў.

Па звестках "Форума-18", 1 чэрвеня 2006 года ўлады вынеслі папярэджанне тром хрысціянам-евангелістам за ўдзел у дваццацічатырохгадзінным няспанні і чытанні Бібліі на цэнтральнай плошчы Брэста з мэтай выразіць салідарнасць з ахвярамі

палітычных рэпрэсій у краіне. Паводле інфармацыі ўладаў, тром нязгодным неабходна было папярэдне атрымаць дазвол дзяржаўных чыноўнікаў на арганізацыю і правядзенне рэлігійнага мерапрыемства за межамі тэрыторыі, прызначанай для набажэнства.

19 траўня 2006 года мясцовыя ўлады аштрафавалі пратэстанцкага святара Іллю Радкевіча на 70 даляраў (150 тысяч рублёў) за адсутнасць рэгістрацыі ў ягонай поўнаевангельскай суполкі і за правядзенне несанкцыянаванай рэлігійнай службы.

6 красавіка 2006 года ўлады аштрафавалі палітычнага апазіцыйнага актывіста Барыса Хамайду на 2600 даляраў (5600 тысяч беларускіх рублёў) за ўдзел у дэманстрацыі з плакатам, на якім была размешчана цытата з Евангелля ад Матфея: "Той, хто вытрывае да канца, будзе ўратарваны". Міліцыянты затрымалі Хамайду на тры гадзіны 20 сакавіка 2006 года за дэманстрацыю плаката і абвінавацілі яго ў парушэнні Закона аб дэманстрацыях.

Згодна інфармацыі "Форума-18", улады неаднаразова штрафавалі членаў адной баптысцкай сям'і за правядзенне несанкцыянаваных рэлігійных сустрэч у іх доме. 21 лістапада 2005 года суд горада Бабруйска наклаў штраф на пастара Ермаліцкага ў памеры 67 даляраў (145 тысяч рублёў) за правядзенне забароненай законам рэлігійнай службы ва ўласным доме. Аднак 25 лістапада 2005 года справа была спынена. Праваахоўныя органы неаднаразова абшуквалі кватэру Ермаліцкага, вылікалі пастара ў мясцовы райвыканкам і шматкроць папярэджвалі аб сур'ёзных наступствах, якія чакаюць яго, калі ён і яно група не спыняць падобныя сустрэчы. 12 снежня 2005 года Ермаліцкі быў аштрафаваны на 13 даляраў (28 тысяч рублёў) за перапланіроўку свайго жылля з мэтай яго выкарыстання як месца набажэнства без атрымання папярэдняга афіцыйнага дазволу. 27 снежня 2005 года ўлады аштрафавалі жонку Ермаліцкага на 270 даляраў (580 тысяч рублёў) за прадстаўленне памяшкання для несанкцыянаванага рэлігійнага сходу.

У час са снежня 2004 года і па канец справаздачнага перыяду ўлады тры разы прадстаўлялі абвінавачванне адміністратару царквы Новае жыццё Васілю Юрэвічу ў правядзенні недазволеных законам рэлігійных службаў і аштрафавалі ў цэлым прыкладана на 5800 даляраў (дванаццаць з паловай мільёнаў рублёў). 22 сакавіка 2005 года суд аштрафаваў пастара гэтай царквы Вячаслава Ганчарэнку на 334 даляры (714 тысяч рублёў) таксама быццам бы за правядзенне несанкцыянаванага сходу. У 2005 годзе Мінгарвыканкам вынес царкве пяць папярэджанняў. Закон дапускае толькі два папярэджанні, пасля чаго царква можа быць закрыта. Акрамя таго, 5 чэрвеня 2006 года ўлады афармілі пратакол на Ганчарэнку за правядзенне несанкцыянаванай рэлігійнай службы ў будынку, які яны лічылі непрыдатным для набажэнства.

9 чэрвеня 2005 года ўлады аштрафавалі пастара Саюза баптысцкіх цэркваў Валерыя Рыжука на 24 даляры (51 тысяча рублёў) за правядзенне процізаконнай рэлігійнай службы. Калі ён адмовіўся плаціць, два судовыя выканаўцы

канфіскавалі з яго кватэры масляны абагравальнік, кошт якога па меншай меры ўдвая перавышаў суму штрафу.

У першай палове 2005 года ўлады аштрафавалі лідэраў вясковага прыходу Рускай праваслаўнай царквы за мяжой у Брэсцкай вобласці за арганізацыю несанкцыянаваных рэлігійных сходаў і іншых мерапрыемстваў у сваіх дамах. Айцец Іаан Грудніцкі, пастар незарэгістраванага прыходу, атрымаў 2 штрафы ў цэлым на суму 1835 даляраў (4,8 мільёны рублёў). Паводле інфармацыі “Форума-18”, брэсцкі прадстаўнік КСРН матываваў “законныя меры” мясцовых уладаў “з мэтай зменшыць несанкцыянаваную дзейнасць” прыходу Грудніцкага і заахвоціць прыхаджан узамен далучыцца да царквы Маскоўскага патрыярхата, дзе “былі створаны нармальныя ўмовы для правядзення рэлігійных абрадаў усімі тымі, хто жадае гэтага”. Прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі аштрафавалі прыхаджанку Лілію Юхноўскую на 32 даляры (72 тысячы рублёў) за тое, што яна “прадставіла свой дом для правядзення несанкцыянаванага рэлігійнага мерапрыемства”. Урад праследаваў членаў БАПЦ, якія ўжо пакінулі ўсе спробы зарэгістравацца.

У 2005 годзе ўлады канфіскавалі будынак былой праваслаўнай царквы ў мястэчку Сёмкаў Гарадок, які мясцовая суполка адрамантавала для БАПЦ, на аснове таго, што рэканструкцыя не была дазволена. Улады заявілі, што яны маюць намер аднавіць і пераабсталяваць царкву для БПЦ, якую называюць законным гаспадаром. БПЦ, паводле наяўных звестак, планавала перамясціць туды сваю суполку, што праводзіла свае сустрэчы ў пераабсталяваным вагоне цягніка. Кіраўнік БАПЦ Леанід Акаловіч, які быў аштрафаваны судом за несанкцынаяванае пераабсталяванне памяшкання і за кіраўніцтва незарэгістраванай рэлігійнай арганізацыяй, быў восенню 2005 года звольнены з працы па надуманай прычыне скарачэння кадраў.

У пачатку снежня 2005 года віцебская міліцыя правярала дамы мясцовых мусульман быццам бы ў сувязі з пошукам падазроных у справе верасноўскіх выбухаў, нават нягледзячы на тое, што ўлады папярэдне арыштавалі двух братоў, якія не мелі бачнай сувязі з ісламам. Міліцыянты затрымалі некалькі мусульман для допыту і канфіскавалі рэлігійную літаратуру.

У 2004 годзе судамі накладаўся штраф на пастара зарэгістраванай царквы Святло свету поўнага евангелля за нібыта правядзенне недазволенага рэлігійнага сходу ва ўласным доме. Штраф быў спагнаны таксама з трох членаў незарэгістраванага Міжнароднага саюза баптысцкіх цэркваў (МСБЦ) за недазволенае наведванне шпіталя падчас рэлігійнага свята. Раней у тым самым годзе святар МСБЦ атрымаў папярэджанне за правядзенне рэлігійнай службы ў Салігорску, а яго арганізацыя атрымала папярэджанне аб спыненні любой нелегальнай рэлігійнай дзейнасці.

Пад непасрэдным уціскам уладаў і з-за праследавання сваіх рэлігійных арганізацый святар БАПЦ Ян Спасюк і кіраўнікі суполкі Святло Кайласа Сяргей і Таццяна Акаданавы ў 2003 годзе пакінулі краіну. Шэраг іншых членаў Святла Кайласа таксама вымушаны былі з’ехаць за мяжу ў сувязі з пастаянным уціскам, а сама

група на працягу справаздачнага перыяду не прадпрымала ніякіх актыўных дзеянняў.

У 2003 годзе місіянер Навагрудскага аб’яднання баптыстаў Юрый Дзянішчык быў аштрафаваны за незаконнае правядзенне малітоўнай службы ў прыватным будынку, што быў зарэгістраваны на імя аб’яднання.

Прымусовы зварот у веру

Не паступала паведамленняў ні пра прымусовы зварот у веру, ні пра непаўналетніх грамадзян ЗША, якія былі б выкрадзены або незаконна вывезены са Злучаных Штатаў, ні пра адмову прадставіць магчымасць такім грамадзянам вярнуцца ў Злучаныя Штаты.

Антысемітызм

У той час, як цягам справаздачнага перыяду назіраліся асобныя выпадкі антысемітызму, сам антысемітызм афіцыйна не ўхваляўся дзяржавай.

Дзяржаўныя перыядычныя выданні працягвалі нападкі на нетрадыцыйныя і яўрэйскія рэлігійныя групы. У студзені 2006 года магілёўскія газеты надрукавалі серыю антысеміцкіх артыкулаў у адказ на выраб у горадзе новага віду кашэрнага хлеба. Дзяржаўная газета “Могилевский вестник” заявіла, што ў кашэрных стравах выкарыстоўваецца кроў ахвярных жывёл і папярэдзіла праваслаўных вернікаў “трымацца далей ад кашэрных прадуктаў такім самым чынам, як яны трымаюцца ўбаку ад ахвярных ідалаў”. “Вечерний Могилев” паведаміў, што сам акт ператварэння якой-небудзь рэчы ў кашэрную з’яўляецца “блюзнерскім і антыхрысціянскім ”.

Па-ранейшаму працягваўся продаж і распаўсюджанне антысеміцкай літаратуры праз дзяржаўную сетку распаўсюждання выданняў, дзяржаўныя ўстановы і кнігарні, што ўваходзяць у сістэму БПЦ. У мінулыя гады антысеміцкая літаратура адкрыта прапаноўвалася на некаторых праваслаўных кніжных кірмашах у Мінску, а таксама ў Доме міласэрнасці, хоспісе, заснаваным па ініцыятыве БПЦ у сталіцы. Прадстаўнікі рымска-каталіцкай царквы паведамлялі, што ў месцах, звязаных з БПЦ, прадавалася таксама і антыкаталіцкая літаратура.

Праз “Праваслаўную кнігу”, што прадае праваслаўную літаратуру і рэлігійную атрыбутыку, па-ранейшаму распаўсюджваліся антысеміцкія і рускія ультранацыяналістычныя газеты і літаратура. “Праваслаўная кніга” з’яўляецца часткай кампаніі “Праваслаўная ініцыятыва”, чый генеральны дырэктар часта друкуе ксенафобскія артыкулы. На працягу справаздачнага перыяду ў кнігарні “Праваслаўная кніга” можна было набыць відэакасеты і DVD антысеміцкага зместу. Акрамя таго, кнігарня распаўсюджвала брашуры, у якіх сцвярджалася, што пры вырабе кашэрнай ежы выкарыстоўваецца кроў. Насуперак выдадзенаму ў 2003 годзе загаду генеральнага пракурора і Міністэрства інфармацыі  аб канфіскацыі з

продажу антысеміцкай і ксенафобскай газеты “Русский вестник”, яе продаж працягваўся. Супрацоўнікі “Праваслаўнай кнігі” паведамлялі, што яны толькі распрадаюць свае запасы, а не новыя выданні. У продажы была таксама кніга “Враги России и славянского мира против Беларуси и президента Лукашенко”. Гэтае ультранацыяналістычнае і ксенафобскае выданне змяшчае раздзел пад аўтарствам Уладзіміра Чартовіча, генеральнага дырэктара “Праваслаўнай ініцыятывы”, выдавецкай кампаніі, заснаванай у Мінску і вядомай сваімі публікацыямі, што спараджаюць нянавісць у адносінах да яўрэяў, мусульман і іншых меншасцяў. Кніга была надрукавана ў Расіі, але прадавалася ў Беларусі праз “Праваслаўную кнігу”. Паводле інфармацыі евангелісцкага біскупа Івана Пашкевіча, “Праваслаўная ініцыятыва” выдала антысеміцкую кнігу пад назвай “Приговор убивающим Россию”, накіраваную на распальванне расавай і этнічнай нянавісці і рэлігійную дыскрымінацыю.

У адказ на патрабаванне яўрэйскай суполкі пакараць “Праваслаўную кнігу”, у 2004 годзе генеральны пракурор загадаў правесці расследаванне гэтага інцыдэнту, каб выявіць факт незаконнага продажу “Праваслаўнай кнігай” літаратуры, што спараджае нецярпімасць. Пазней Генеральная пракуратура перадала справу ў Мінскую гарадскую пракуратуру. Апошняя заявіла, што падстаў для ўзбуджэння крымінальнай справы няма. КСРН сцвярджае, што публікацыя такой літаратуры ў краіне супярэчыць закону, аднак немагчыма забараніць увоз літаратуры, выдадзенай у Расіі.

17 красавіка 2006 года ўлады вынеслі афіцыйнае папярэджанне настаўніцы дашкольнага навучання Людміле Ізаксон-Балатавіцкай за “намеранае выкладанне рэлігійных дактрын малалетнім дзецям”. Ізаксон-Балатавіцкая са сваім яўрэйскім дзіцячым музычным гуртам выступала па мясцовым тэлебачанні падчас адзначэння яўрэйскага свята. Улады заявілі, што яна парушыла закон, праводзячы ў дзяржаўным будынку рэлігійныя сяткаванні і нелегальна прапагандуючы іудаізм праз тэлебачанне, якое асвятляла гэтую падзею. Улады прымусілі Ізаксон-Балатавіцкую прыбраць яўрэйскую сімволіку з памяшкання класа і пагражалі ёй у будучыні судовым праследаваннем у тым выпадку, калі яна працягне такога роду дзейнасць.

За перыяд, ахоплены дадзенай справаздачай, у Гродна былі завершаны земляныя работы і рэканструкцыя стадыёна, закладзенага ў 1950-ыя гады на месцы былых яўрэйскіх могілак. У ходзе земляных работ знаходзілі чалавечыя рэшткі, якія мясцовыя ўлады паабяцалі вывезці з аб’екта для далейшага перазахавання. Замест таго, фотаздымкі, зробленыя прадстаўнікамі яўрэйскай супольнасці, дэманструюць чалавечыя рэшткі, змяшаныя з зямлёй са самазвалаў, што ішла на аднаўленне дарожнага насыпу. У 2004 годзе падчас свайго візіту супрацоўнікі амбасады ЗША знаходзілі чарапы і косткі, раскіданыя па ўсёй тэрыторыі.

І толькі пасля моцнага ўціску з боку міжнароднай супольнасці мясцовыя ўлады падпісалі ў 2003 годзе пагадненне з лідэрам беларускай яўрэйскай абшчыны, у якім прадугледжвалася спыненне работ і перазахаванне знойдзеных рэштак на

тэрыторыі розных яўрэйскіх могілак. У 2006 годзе яўрэйская абшчына атрымала дазвол ўладаў павесіць шыльду, якая б паведамляла, што стадыён стаіць на былых яўрэйскіх могілках. Мясцовыя яўрэйскія лідэры палічылі, што гэта сітуацыя адлюстроўвае абыякавыя да іх адносіны ў большай ступені, чым антысемітызм. Вядома таксама, што ўлады дазволілі перакапаць частку ветэранскіх ды праваслаўных могілак цягам іншых будаўнічых праектаў.

У адрозненне ад папярэдніх справаздачных перыядаў, у гэты час афіцыйныя асобы не дазвалялі сабе публічных антысеміцкіх выказванняў. У снежні 2005 года аўтар Эдуард Скобелеў, рэдактар бюлетэня Адміністрацыі Прэзідэнта, выпусціў кнігу пад назвай "Завет Сталина" са спасылкай, што гэта кніга была выдадзена пры падтрымцы Адміністрацыі Прэзідэнта. У кнізе змяшчаецца шэраг антысеміцкіх выказванняў і прыцягненых за вушы абвінавачанняў. У 2003 годзе, згодна матэрыяляў "Associated Press" Сяргей Касцян, намеснік старшыні Камісіі па міжнародных справах ніжняй палаты парламента, адхіліў крытыку ў сувязі з пракладкай газаправоду блізу былых яўрэйскіх могілак у Мазыры, абвінаваціўшы яўрэйскіх лідэраў у распальванні "нацыянальнай варожасці". На прэс-канферэнцыі, што адбылася ў 2003 годзе, міністр інфармацыі Уладзімір Русакевіч сказаў, што Беларусь павінна жыць з Расіяй, як браты, а таргавацца, "як жыды".

Лідэры яўрэйскай супольнасці мяркуюць, што цяпер адбываецца меней фактаў вандалізму, чым некалькі гадоў таму, дзякуючы міжнароднаму ціску, а таксама ўзмацненню высілкаў, якія ажыццяўляюць мясцовыя ўлады для абароны рэлігійных аб'ектаў. Акрамя таго, мясцовыя ўлады і жыхары часта аднаўляюць пашкоджаныя помнікі і магілы за ўласныя сродкі. Паводле інфармацыі КСРН, абласныя ўлады па ўсёй краіне працягваюць прымаць меры для папярэджання вандалізму, у тым ліку будуюць агароджу вакол могілак, рэгулярна патрулююць тэрыторыю вакол іх і збіраюць інфармацыю ды робяць справаздачы пра выпадкі вандалізму.

Шэраг яўрэйскіх рэлігійных аб'ектаў пацярпелі ад выпадкаў вандалізму цягам справаздачнага перыяду. У лістападзе 2005 года былі апаганены гомельскія раённыя могілкі, дзе былі разбіты надмагільныя пліты. 17 жніўня 2005 года вандалы апаганілі мемарыяльны комплекс "Яма", прысвечаны яўрэйскім ахвярам Халакосту, спалілі штучныя кветкі і раскідалі надмагільныя камяні. Улады не вылавілі адказных за гэтыя ўчынкі. У 2004 годзе ў цэнтры Брэста на тэрыторыі мемарыяльнага комплекса ў памяць ахвяраў Халакосту хуліганы падпалілі вянкі, раскідалі кветкі і папсавалі зорку Давіда. Мемарыял апаганьваўся 5 разоў з моманту свайго адкрыцця. Міліцыянты так нікога не аштрафавалі і не пазбавілі волі за гэтае злачынства. 26 красавіка 2005 года вандалы зноў пашкодзілі помнік, узведзены ў Лідзе ў памяць яўрэяў, што былі забіты ў часы Другой сусветнай вайны. Яўрэйская супольнасць не паведаміла пра гэты акт вандалізму, паколькі помнік у Лідзе апаганьваўся кожную вясну, але ніхто так і не быў затрыманы. У пачатку траўня 2005 года неапазнаныя вандалы разбілі 20 надмагільных пліт у Мікашэвічах. Мясцовае яўрэйскае насельніцтва крытыкавала праваахоўныя органы за няздольнасць адказаць на злачынства і арыштаваць каго-небудзь з падазроных,

падкрэсліваючы той факт, што могілкі знаходзяцца за некалькі метраў ад міліцэйскага ўчастка.

Яўрэйская супольнасць занепакоена распаўсюджаннем ідэі “вялікага славянскага саюза”, папулярная сярод нацыяналістычных арганізацый, што дзейнічаюць у краіне, такіх як Рускае нацыянальнае адзінства (РНА), якое яшчэ працягвае існаваць, нягледзячы на афіцыйны роспуск у 2000 годзе, а таксама нацыянал-бальшавісцкая партыя, яшчэ адна праруская экстрэмісцкая арганізацыя ў Беларусі. У 2004 годзе члены РНА распаўсюджвалі антысеміцкую літаратуру ў гарадскіх аўтобусах Гомеля, а яўрэйскія абшчынныя цэнтры ў Гомелі і Полацку былі апаганены насценнымі надпісамі РНА. Расследаванне гэтых актаў вандалізму так і не прывяло да арыштаў вінаватых.

Нягледзячы на тое, што вэб-сайт яўрэйскіх артадаксальных скінхэдаў (ЯАСХ), арганізацыя, якая быццам бы створана яўрэйскай моладдзю для змагання з антысемітызмам і ксенафобіяй, быў даступным на працягу ўсяго справаздачнага перыяду, ён так і не быў больш адноўлены. Насуперак заяўленым “арганізацыяй” мэтам, вэб-сайт заклікаў яўрэяў да правакацыйных дзеянняў у адносінах да ўрада ў барацьбе за сваю справу і ўтрымліваў зневажальныя выказванні пра беларускіх грамадзян неяўрэйскага паходжання і вядомых кіраўнікоў беларускай яўрэйскай супольнасці. Некалькі яўрэйскіх лідэраў, што палічылі вэб-сайт зневажальным і правакацыйным, асудзілі яго і выказалі афіцыйным уладам сваю занепакоенасць. Гэты вэб-сайт мае спасылку на іншы сайт, які нібыта падтрымліваецца скінхэдамі Харэ Крышна.

Афіцыйны беларускі праваслаўны малітоўны каляндар, надрукаваны ў Мінску, як і раней адзначае 20 траўня як гадавіну гібелі ў 1690 годзе Гаўрылы Беластоцкага, малалетняга дзіцяці, якога недалёка ад Гродна нібыта звялі са свету яўрэі. Малітва за 20 траўня, прысвечаная Беластоцкаму, называе яўрэяў “сапраўднымі звярамі”, якія быццам бы выкралі і забілі Беластоцкага ў рэлігійных мэтах. Акрамя таго, вэб-сайт БПЦ прылічае Беластоцкага да ліку сваіх святых пакутнікаў.

Паляпшэнне сітуацыі і рост павагі да свабоды веравызнання

1 снежня 2005 года прэзідэнт выдаў указ, які вызваліў усе зарэгістраваныя рэлігійныя групы ад падатку на зямлю, на якой знаходзяцца пабудовы і іншая маёмасць, што выкарыстоўваецца для набажэнства.

Цягам справаздачнага перыяду дзяржава фінансавала аднаўленне праваслаўнага манастыра ў Слоніме і касцёла Святой Дзевы Марыі ў Мінску. Урад таксама вылучыў 14 тысяч даляраў (30 мільёнаў рублёў) і 258 тысяч даляраў (554 мільёны рублёў) на рэстаўрацыю фрэсак у праваслаўнай царкве Полацка і ў каталіцкім кафедральным саборы Мінска адпаведна. У траўні 2006 года прэзідэнт пастанавіў вярнуць былы сабор і маёмасць рымска-каталіцкаму прыходу ў Мінску.

У снежні 2005 года прэзідэнт прызнаў важную ролю рымска-каталіцкай царквы, якую тая адыгравала ў краіне, і паабяцаў аказаць ёй падтрымку.

Частка 3. Знявагі і дыскрымінацыя ў грамадстве

У цэлым прыязныя ўзаемаадносіны паміж рэлігіямі і шырока распаўсюджаная ў грамадстве этыка цярпімасці садзейнічалі свабодзе веравызнання, аднак паранейшаму мелі месца антысемітызм і негатыўнае стаўленне да рэлігійных меншасцяў. У красавіку 2006 года незалежная сацыялагічная арганізацыя НОВАК правяла апытанне “Наколькі вы давяраеце дзяржаве, грамадскім інстытутам і арганізацыям?” Згодна апытанню, найбольшым даверам у краіне карыстаецца БПЦ: 70 адсоткаў рэспандэнтаў давяраюць ёй, у той час як 45,2 адсоткі выказваюць давер рымска-каталіцкай царкве і 15,4 адсоткі – пратэстанцкім цэрквам. Узровень недаверу да пратэстанцкіх цэркваў узняўся з 36 адсоткаў рэспандэнтаў у 2005 годзе да 58,5 адсоткаў, а ўзровень недаверу да рымска-каталіцкай царквы ўзняўся з 20 адсоткаў у 2005 годзе да 35 адсоткаў у 2006.

Як і ў папярэднія часы, невядомыя хуліганы разбуралі і праваслаўныя, і неправаслаўныя крыжы, пастаўленыя ў Курапатах, урочышчы, дзе па загадзе Народнага камісарыята ўнутраных спраў (НКУС) у 1930-ыя гады было расстраляна больш за 300 тысяч чалавек. Цягам тыдня, пачынаючы з 27 лістапада 2005 года, у Курапатах было пашкоджана прыкладна 12 крыжоў. Вандалы таксама выразалі свастыку на выяве іконы на крыжы непадалёк ад уваходу. Сведкі расказвалі, што знікла мемарыяльная шыльда, а фотаздымкі ахвяраў НКУС былі знішчаны. Міліцыя адмовіла факт вандалізму і спісала пашкоджанні на надвор’е. У выхадны дзень 3 снежня 2005 года іншыя мемарыялы, у тым ліку яўрэйскі мемарыяльны камень і руская праваслаўная ікона, былі апаганены чырвонымі свастыкамі і фашысцкімі сімваламі СС. У адказ на гэта ўлады пагадзіліся забяспечыць кругласутачны нагляд за мемарыяльнымі аб’ектамі ў Курапатах. Дакладна невядома, ці зрабілі гэта ўлады, аднак графіці зніклі.

9 студзеня 2006 года незалежнае інфармацыйнае агенцтва БелаПАН паведаміла, што некалькі дзесяткаў скінхэдаў прайшлі маршам праз Гродна, выкрыкваючы непрыстойныя словы і фашысцкія лозунгі і нападаючы на пешаходаў. Адна з ахвяраў расказала журналістам, што 30 скінхэдаў прайшлі праз цэнтральную плошчу горада і збілі яго пасля таго, як ён зрабіў спробу іх спыніць. Як толькі прыехала міліцыя, удзельнікі дэманстрацыі рассеяліся. Паводле паведамленняў сведак, гэта быў першы марш скінхэдаў у Гродна за апошнія 5 гадоў. Улады заявілі, што яны не ведалі ні пра якую дэманстрацыю такога роду.

15 сакавіка 2005 года галава БПЦ абвясціў, што царква забрала сваю частку акцый выдавецкай кампаніі “Праваслаўная ініцыятыва”, вадомай сваім продажам антысеміцкай літаратуры. Галава царквы абвінаваціў кампанію ў распаўсюджанні ідэй, скіраваных на раскол грамадства, што несумяшчальнае з праваслаўнымі каштоўнасцямі. Галава царквы заявіў, што далейшае супрацоўніцтва з выдаўцом парушае праваслаўныя каноны і загадаў усім праваслаўным прыходам пазбягаць іх

кніг і ўтрымліваціца ад кантактаў з кампаніяй. Акрамя таго, 27 чэрвеня 2006 года БПЦ паінфармавала "Праваслаўную ініцыятыву" (сёння – "Хрысціянская ініцыятыва"), што яна не можа больш выкарыстоўваць праваслаўныя сімвалы і мову.

Не мелася сведчанняў пра тое, што БПЦ змяніла свае погляды на супрацоўніцтва выключна з тымі рэлігійнымі групамі, якія маюць у краіне "гістарычныя карані". 12 верасня 2005 года галава БПЦ ухваліў рост супрацоўніцтва паміж БПЦ і рымска-каталіцкай царквой і абвясціў, што "каталікі могуць дапамагчы праваслаўным хрысціянам зладзіць з новым секулярызмам заходняга тыпу".

5 красавіка 2006 года БПЦ прыйшла да рашэння, што палітычныя дакументальныя стужкі намесніка старшыні Белтэлерадыёкампаніі Юрыя Азаронка не могуць быць прадэмантраваны на арганізаваным БПЦ фестывалі, прысвечаным Вялікадню. Першапачатковая праграма фестывалю ўключала сустрэчу з Азаронкам, агульнавядомым дзяржаўным прапагандыстам, а таксама паказ яго палітычнага дакументальнага фільма "Духоўная вайна". Тым не менш, БПЦ вырашыла, што праграма павінна быць зменена, пасля атрымання ліста пратэсту ад маладых вернікаў, якія былі супраць паказу фільмаў, паколькі яны маглі дыскрэдытаваць БПЦ і яе кіраўніцтва.

У 2004 годзе ў Брэсцкай вобласці злодзеі скралі з праваслаўнай царквы 12 ікон і бронзавы крыж. Міліцыя распачала расследаванне. Перад гэтым брэсцкія абласныя праваахоўныя органы злавілі двух злодзеяў і знайшлі дзве з трох, скрадзеных у 2001 годзе ікон.

12 верасня 2005 года праваахоўныя органы абвінавацілі мужчыну ў хуліганстве пасля таго, як ён разбіў дзве статуі ў саборы Святой Дзевы Марыі ў Мінску.

У 2004 годзе арганізацыя "Грамадзянская ініцыятыва за свабоду веравызнання" выдала другую частку "Белай кнігі" – збору дакументаў, якія даюць падрабязную інфармацыю пра шматлікія парушэнні ўладамі свабоды веравызнання, інфармуюць пра рэлігіёзные закон і прыводзяць розныя справаздачы аб сітуацыі са свабодай веравызнання ў краіне.

Частка 4. Палітыка ўрада ЗША

Урад ЗША абмяркоўвае пытанні свабоды веравызнання з урадам Беларусі ў межах сваёй агульнай палітыкі па абароне правоў чалавека. Супрацоўнікі амбасады падтрымлівалі рэгулярныя кантакты з прадстаўнікамі рэлігійных груп і дзяржаўнымі службовымі асобамі, адказнымі за рэлігійныя пытанні, сустракаліся з грамадзянамі ЗША рознага веравызнання, якія пражываюць у Беларусі або часта прыязджаюць сюды, з мэтай абмеркавання пытанняў свабоды веравызнання ў краіне.

Падчас сустрэч з рознымі дзяржаўнымі чыноўнікамі і прадстаўнікамі міністэрстваў восенню 2005 года, супрацоўнікі амбасады закраналі пытанні, звязаныя з законам 2002 года і пытанні адмовы ў рэгістрацыі некаторых рэлігійных суполак. У 2006 годзе супрацоўнікі амбасады спрабавалі абмеркаваць наступныя пытанні свабоды веравызнання з новым кіраўніком КСРН Леанідам Гулякам, аднак так і не атрымалі дазвол на сустрэчу. Супрацоўнікі амбасады таксама прасілі аб асобнай сустрэчы, каб абмеркаваць зняволенне пратэстанцкага святара Георгія Вязорскага, і двойчы атрымалі адмову ўладаў.

Амбасада пільна сачыла за працягам продажу антысеміцкай і ксенафобскай літаратуры ў кіёсках і на мерапрыемствах, звязаных з БПЦ, а таксама праз дзяржаўную сетку распаўсюджвання друкаваных выданняў. На працягу ўсяго справаздачнага перыяду супрацоўнікі амбасады таксама некалькі разоў наведвалі месца яўрэйскіх захаванняў у Гродна і абмяркоўвалі сітуацыю з мясцовымі ўладамі і кіраўнікамі супольнасці. Супрацоўнікі амбасады, у тым ліку амбасадар, бралі ўдзел у шэрагу мерапрыемстваў, што праводзіліся рознымі рэлігійнымі групамі. Амбасада таксама рэгулярна абмяркоўвала рэлігійныя пытанні з прадстаўнікамі замежных дыпламатычных місій, акрэдытаваных у краіне.